Весці БДПУ. Серыя 1. 2017. № 1. С. 150–156.

УДК: 821.161.3 Я. Баршчэўскі

# МЕТАМАРФОЗЫ РАМАНТЫЧНЫХ ГЕРОЯЎ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА: АД ІДЭАЛА ДА ІДАЛА

UDC 821.161.3 Я. Баршчэўскі

# «TRANSFORMATIONS OF JAN BARSZCZEWSKI'S ROMANTIC HEROES. FROM AN IDEAL TO AN IDEAL"

**Л. П. Леська,**
*старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры і культуры БДПУ*

**L. Leska,**
*Senior Teacher of the Department of Belarussian Literature and Culture, BSPU*

Паступіў у рэдакцыю 09.01.17.

Received on 09.01.17.

У артыкуле даследуецца амплітуда адчуванняў рамантычных герояў пісьменніка, якая вагаецца ад радасных усхваляванняў да выключных расчараванняў, якія часам вядуць, да гіпертрафічных змен герояў, іх акамяненняў, адзервяненняў, заўчаснай гібелі.
Сцвярджаецца думка, што рэлігійнасць аўтара стала генетычнай і сутнаснай асновай яго творчасці і набыла сваю выключную жыццястойкасць і сілу ў пераломны момант пераходу ад асветніцтва да рамантызму.
Адным з ключавых міфапаэтычных вобразаў пісьменніка стаў вобраз бессмяротнай душы. Ян Баршчэўскі-рамантык размяжоўваў *дух, душу і сэрца*, але і ўсхваляў ідэал адзінства іманентнага і трансцэндэнтнага, канечнага і бясконцага.

*Ключавыя словы:* ідэал, рамантызм, ідал, рамантычная апантанасць, рамантычны герой, рамантычная расчараванасць, духоўная эвалюцыя, дух, душа, цела.

The article "Transformations of Jan Barszczewski's romantic heroes. From an ideal to an ideal" covers the amplitude of feelings which the romantic heroes of the writer experience. It varies from joyful excitement to complete disenchantments which sometimes lead to hypertrophic changes in the heroes, their petrifaction, "woodenness" and premature death.
There is an idea that the author's religiousness became genetic and was the inner ground of his creative work acquiring its exceptional resilience and power at a turning point, from enlightenment to romanticism.
One of the key mythological poetic images of the writer was the image of an immortal soul. The romanticist Jan Barszczewski differentiated between spirit, soul and heart, but he exalted an ideal of the unity of the immanent and the transcendent, the finite and the infinite.

*Key words:* Belarusian literature of the 19th century, ideal, romanticism, idol, romantic obsession, romantic disenchantment, spiritual evolution, spirit, soul, body.

У беларускай навуцы ўжо даўно сцверджана меркаванне, што па творчым метадзе, па агульных прынцыпах адносін да рэчаіснасці Ян Баршчэўскі меў сувязь з рамантызмам[1], які, паводле слоў Максіма Гарэцкага, *«адбіўся ў яго любові да старыны, да народнай паэзіі, усякай чартоўшчыны й містычнасці»* [1, с. 176].

Адметнасць мастацкага светаадчування пісьменніка, паводле бачання А. Лойкі, праявілася ў шчырым захапленні ірэальным і ў «культавым пакланенні ім» [2, с. 94] і нават наклала адбітак на знешняе аблічча аўтара фантастычных апавяданняў. Даследчык уяўляў Я. Баршчэўскага *«рамантычным адзіночкай, беспрытульным сіратой, які блізкі да сярэдневяковага мінезінгера ці барда»* [2, с. 94]. *«Вятры новага часу абвявалі прыгожы твар гэтага чалавека, усмешлівыя вочы, высокі адкрыты лоб пад хвалістымі спадамі валасоў»* [2, с. 94], – такім яго бачылі сяляне і шляхціцы на Полаччыне і Віцебшчыне, дзе няўрымслівы рамантык збіраў фальклор.

Пачатак рамантычнай эпохі рускай і замежнай літаратуры супаў з вялікімі зменамі ў свеце, падзеяй вялікага значэння стала Французская рэвалюцыя 1789–1794 гг., уздзеянне якой адчувалася не толькі ў Францыі, але і ва ўсёй Еўропе. Водгукі гэтай гістарычнай падзеі выявіліся ў рамантычным светаўспрыняцці Яна Баршчэўскага, у новай трактоўцы асобы і яе духоўнай арганізацыі. Героем рамантычных апавяданняў са зборніка «Шляхціц Завальня…» і аповесці «Душа не ў сваім целе» стаў персанаж, які парывае

[1] Разгляд сувязей пісьменніка з рамантызмам не абазначаеператварэнне аўтара толькі ў рамантыка. У творчасці Я. Баршчэўскага ўвасобіўся цэлы комплекс разнастайных ідэйна-эстэтычных і мастацкіх традыцый.

са старымі сувязямі, ён імкнецца сцвердзіць сваё непадабенства да іншых. Так, Карпа (апавяданне «Пра чарнакніжніка і цмока»), Васіль (апавяданне «Зухаватыя ўчынкі»), лоўчы Міхась (апавяданне «Вужыная карона») адыходзяць ад звыклага патрыярхальнага жыцця, імкнуцца спасцігнуць таямніцы светабудовы, асэнсаваць ірэальнае, раскрыць загадкі сваёй уласнай душы. У настроі гэтых герояў, кажучы словамі А. Б. Ботнікавай – паслядоўнай даследчыцы рускага і нямецкага рамантызму [3], вызначаецца аптымізм, аднак, як заўважае навукоўца, *«ён быў толькі зыходнай кропкай»* [3, с. 18]. Хаця С. Франк бачыць XIX стагоддзе насычаным *«і духоўнымі з'явамі зусім іншага парадку, гэты перыяд у літаратуры адкрываецца пачуццём сусветнага суму, сусветнай тугі, якая была дамінуючай у светаадчуванні Байрана, Леапардзі, Альфрэда Мюсэ, Лермантава, Баратынскага і Цютчава»* [4, с. 362]. У сувязі са слушнымі тлумачэннямі замежных даследчыкаў, правамерна ўзнікае пытанне: якія ж яркія пачуцці перажываюць героі Яна Баршчэўскага?

Гіпатэтычным для нашай працы стала меркаванне, што большасць персанажаў са зборніка «Шляхціц Завальня…» і аповесці «Душа не ў сваім целе» праходзяць сімвалічны рух ад летуценнага набліжэння да ідэалу, а затым – да трагічнага ідальнага змярцвення.

Амплітуда адчуванняў рамантычных герояў Яна Баршчэўскага вагаецца *ад радасных усхваляванняў да выключных расчараванняў, якія часам вядуць да гіпертрафічных змен герояў, іх акамяненняў, адзервяненняў*, заўчаснай гібелі, як гэта і здарылася ў выпадку з Васілём (апавяданне «Зухаватыя ўчынкі»), які не верыць у людскія забабоны. Герой узвышае сябе над прыродай, ён мае смеласць братацца з віхорам (хаця ў народзе бытавала меркаванне аб нячыстым пачатку, прыхаваным у гэтай прыроднай з'яве), паказваючы сваю неардынарнасць і схільнасць да перамен. Новае ў жыцці Васіля, непадабенства да іншых, уяўлялася яму блізкім да ідэалу (гэта і жаніцьба на Алюце, маці якой у вачах аднавяскоўцаў выглядала страшнай чараўніцай, гэта і жаданне разбагацець з дапамогай Змiёвага каменя). Такія ўчынкі прыносяць герою Я. Баршчэўскага выключную радасць і аптымізм, якія потым пераходзяць ва ўзмоцненую форму роспачы і заканчваюцца ягонай гібеллю (перажыўшы крах, Васіль гіне невядома дзе).

Канчына зухаватага хлапца была заканамернай, як і фінал жыцця Карпы (апавяданне «Пра чарнакніжніка і цмока»), які, нягледзячы на ўсе адмоўныя рысы яго характару, быў чалавекам прагрэсіўным. Карпа ўносіў у штодзённае жыццё змены: сваё вяселле праводзіць па новых звычаях і хату пабудаваў адметную, і жонку прымушае апранацца па новай модзе, нязвычна для сялян. Такая аўтарская характарыстыка персанажа, на думку В. Каваленкі, «заслуга пісьменніка ў тым, што ён паказаў рамантычны ўздым душы над звыклым, патрыярхальным жыццём», але яшчэ болей істотнае тое, што Ян Баршчэўскі «адчуў небяспеку для чалавека амаральнай, гэта значыць капіталістычнай адарванасці ад народнай глебы». Капіталізацыя параджала хцівасць і пісьменнік бачыў яе ўсё большую распаўсюджанасць. У «Шляхціцы Завальні…» ўсе, *«хто хоча вырвацца з патрыярхальных умоў жыцця і пабагацець, стаць вышэй іншых, вымушаны прадацца душой нячыстай сіле, гэта значыць адкінуць усякую мараль і пайсці на самавынішчэнне»* [5, с. 82].

Такі сумны фінал жыцця рамантычных герояў са зборніка «Шляхціц Завальня…» быў матываваны вузкімі асабістымі, індывідуальнымі задачамі і мэтай, якія не мелі высокай трактоўкі і выключнага сацыяльна-грамадскага значэння. Аднак, як грунтоўна адзначыў В. Каваленка ў сваёй працы «Вытокі. Уплывы. Паскоранасць», *«існуе ў герояў Баршчэўскага душэўная ўзбуджанасць іншага характару, калі асаблівыя рамантычныя натуры парываюць са звыкласцю прыземленага жыцця дзеля высакароднай мэты, дзеля пошукаў новых вялікіх ісцін»* [5, с. 82], дзеля актыўнага служэння Радзіме (аб якім так слушна зазначыў М. Хаўстовіч, вылучаючы асноўныя прыступкі ў служэнні Радзіме, *«дзеля выкання выключнай місіі – быць прарокам у сваім краі»* [6, с. 83].

Такімі ў мастацкіх творах Я. Баршчэўскага, паводле заўваг В. Каваленкі, М. Хаўстовіча, выступаюць Сын Буры, Пакутны Дух, Летуценнік Севярын (са зборніка «Шляхціц Завальня…»), урач Саматніцкі, пан Рылец, Зянон (з аповесці «Душа не ў сваім целе»). Гэтыя героі, па вызначэнні М. Хаўстовіча [7], ідэальныя, *«яны прайшлі этап нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Пісьменнік стварае вобраз ідэальнага героя, увасобіўшы яго ў некалькіх постацях. Напачатку Ян Баршчэўскі вымалёўвае толькі контуры гэ-*

*тага героя: і Сын Буры і Пакутны Дух – гэта ўсяго толькі сімволіка – алегарычнае адлюстраванне ідэі ідэальнага героя, пазней пісьменнік напаўняе ідэю рэальным зместам: пан Генрык, летуценнік Севярын – гэта з розных бакоў пададзены вобраз нацыянальна-свядомага беларуса»* [7, с. 84]. Пагаджаючыся са слушнымі тлумачэннямі В. Каваленкі, М. Хаўстовіча, у сваім даследаванні мы раскрыем адметнасць аўтарскага бачання ідэальнага героя ў апавяданнях са зборніка «Шляхціц Завальня…» і аповесці «Душа не ў сваім целе».

«Ідэальны вобраз паўночнабеларускага шляхціца, – як слушна зазначае С. А. Шыдлоўскі, – зазнаў уплыў сацыяльна-палітычных і культурных зрухаў, якія адбываліся ў беларускім грамадстве канца XVIII – першай паловы XIX стагоддзя» [8, с. 131]. Ён стаў сімвалічным водгукам на такія выклікі часу, як падзел Рэчы Паспалітай, разбор шляхецкага саслоўя, станаўленне эстэтыкі рамантызму.

Ян Баршчэўскі як пісьменнік-рамантык быў у пастаянным пошуку абсалютнага і безумоўнага ідэалу, што скіроўвала яго ўвагу да ідэалізаванага мінулага, да народнага жыцця, да народнай псіхалогіі, занатаванай у фальклоры, у міфах, у рэлігійным светаадчуванні.

Рэлігійнасць аўтара, паводле слушнага тлумачэння К. Лецкі, *«стала генетычнай і сутнаснай асновай творчасці Я. Баршчэўскага і набыла сваю выключную жыццястойкасць і сілу ў пераломны момант пераходу ад асветніцтва да рамантызму»* [9, с. 17]. Гэта праявілася ў тым, што Ян Баршчэўскі выразна размяжоўваючы *дух, душу і сэрца*, усхваляў ідэал, адзінства іманентнага і трансцэндэнтнага, канечнага і бясконцага, ён паказаў чалавека ўключаным у бясконцы ланцуг быцця.

Так, да бясконцага, да Боскага набліжаецца дзед Гараська (апавяданне «Стогадовы стары і чорны госць»), які духоўна ўдасканаліўся і ўжо гатовы перайсці ў царства боскае (праз ператварэнне фізічнага цела ў астральнае), стаць ідэалам для сваіх суседзяў і блізкіх. Стары чалавек быў узнагароджаны за свае праведнае жыццё дарам прадбачання, ён адчуў, што адбудзецца пераход: *«Запрасіў сёння вас да сябе паказаць вам дом вечнасці, які сваімі рукамі сабе збудаваў. Хутка думаю перабрацца ў гэтую вечную хату»* [10, с. 252]. У прадчуванні гэтага пераходу эфірны двайнік героя Я. Баршчэўскага паўстае перад многімі вяскоўцамі: *«дзверы не адчыняліся, а Гараська стаіць пасярод хаты. Са страхам глядзім на яго. Ён стаіць моўчкі і нерухома, твар яго смутны і выказвае штосьці незразумелае, уся постаць лёгкая і, здаецца, вышэйшая, чым зазвычай. З кожнаю хвілінаю ён робіцца ўвачавідкі лягчэйшы і танчэйшы і растае ў паветры»* [10, с. 250]. Яго эфірны двайнік можа аддзяляцца ад цела, *«пашыраючыся ў выглядзе бачнага арэола, або аўры»* [10, с. 86]. Існаванне Гараські ў астральным целе – паказчык духоўнай эвалюцыі героя, вынікам якой і стала свабоднае існаванне неабцяжаранай душы.

Ідэальнае існаванне для сваёй душы мае мачымасць набыць і кабета Інсекта (апавяданне «Кабета Інсекта»). Парушэнне хрысціянскіх запаведзяў, што адбылося напачатку апавядання, прывяло жанчыну да інэвалюцыі – яна ператварылася ў насякомае (лац. insekta). Лагічным завяршэннем зваротнай метамарфозы ў фінале апавядання стала абнаўленне гераіні: малітва ачышчае грэшніцу і яна пераходзіць на новую ступень набліжанасці да Бога, доказам гэтага стала яе з'яўленне перад ксяндзом у «пекным абліччы», «падобнай да анёла» [10, с. 296].

Новы воблік Інсекты (апавяданне «Кабета Інсекта»), як і Маркі (апавяданне «Ваўкалак») – знак Боскай усемагутнасці і яго прысутнасці ў жыцці чалавека.

Сувязь паміж энергіяй чалавека і Бога ў апавяданні «Ваўкалак» праяўляецца ў развіцці героя, не ў формах знешняга росту, а ва ўнутраных новаўтварэннях. Сваім зместам гэты твор падобны да раннехрысціянскіх жыцій, дзе таксама падаваліся два вобразы чалавека, раздзеленых і аб'яднаных крызісам перараджэння: вобраз грэшніка (да перараджэння) і вобраз праведніка – святога (пасля перараджэння). У апавяданні «Ваўкалак» пакуты з'яўляюцца лагічнай перадумовай ачалавечвання героя і вядуць яго да эвалюцыйнага росту, бо *«не з праху выходзіць гора, і не з зямлі вырастае бяда, але чалавек нараджаецца на пакуты, як іскры, каб паднімацца ў вышыню»* [11, Іоў, 5:6 – 7].

Так, пакуты і пакорлівае змірэнне з наканаванасцю лёсу, самаахвяраванне дзеля іншых духоўна ўзвышаюць Агапку («Пра чарнакніжніка і цмока»), сакралізуюць Амелію («Валасы, якія крычаць на галаве»), Сірату (паэма «Жыццё Сіраты»), робяць празарлівым драўлянага Дзядка («Драўляны Дзядок і кабета Інсекта»).

Агапка – гераіня апавядання «Пра чарнакніжніка і цмока» стала ідэалам прыгажосці, як знешняй, так і ўнутранай, яе воблік – сама гармонія душы і цела. Прыгажосць Агапкі моцна ўразіла падарожнага, які прыгадвае, што дзяўчына была пекнай, здаровай і румянай, *«даўней, як прыбярэцца <…> свеціцца як цвет макавы, усе не могуць на яе наглядзецца»* [10, с. 97].

Натуральная краса дзяўчыны стала выяўленнем народнага ідэалу прыгажосці і сведчаннем цэльнасці і сапраўнасці натуры, якая становіцца патэнцыяльнай магчымасцю для набыцця духоўнай дасканаласці. Сапраўды, гэтая надзвычай прыгожая дзяўчына з годнасцю пераносіць жыццёвыя выпрабаванні. Яна вымушана ісці замуж за нялюбага Карпу, калі яе каханы прапаноўвае пакінуць усё і ўсіх, уцячы ў далёкі край і там быць шчаслівымі, Агапка пакорліва адказвае: *«Я кахаю цябе, але не магу згадзіцца і пайсці з табою, бо бацькі мае будуць пакутаваць. Няхай лепш я сама буду ахвярай свайго няшчасця, каб толькі яны былі спакойныя»* [10, с. 99].

Такое адкрытае самаадмаўленне набліжае дзяўчыну да бясконцага, Боскага. Духоўны рост гераіні адбываецца праз пасрэдніцтва ахвяравання. Напачатку Агапка, даведаўшыся пра непазбежнасць злыбед у сваім жыццёвым лёсе, ідзе да абраза Прачыстай маці, *«узяўшы ядвабныя стужкі, якія найбольш любіла, і колькі кавалкаў кужалю, што сама ткала, пайшла да касцёла і, павесіўшы ўсё гэта на абраз Прачыстае Маці, пала ніц, енчачы і заліваючыся слязьмі»* [10, с. 99]. Ахвяра дзяўчыны – гэта сімвалічны абмен матэрыяльных даброт на ўзрастанне духоўнага пачатку. Агапка прынесла ў дар Боскасці тое найлепшае, чым яна валодала ў жыцці, спадзеючыся на дапамогу, і, сапраўды, Бог дапамог. Яна стала моцнай, не перажывае разбуральнага шкадавання, нават спакойна і мудра адмаўляецца ад свайго кахання.

Такім жа выключным самаахвяраваннем, якому папярэднічае ціхмянае змірэнне з наканаванасцю лёсу, надзелена і Амелія. Гераіня апавядання «Валасы, якія крычаць на галаве» валодала цудоўнымі знешнімі вартасцямі, мае *«стройны стан, мастак мог бы напісаць з яе найпрыгажэйшы абраз»* [10, с. 229]. У выпадку з Агапкай пісьменнік адзначае, што яна ў цяжкія хвіліны свайго жыцця ідзе да абраза Прачыстай маці, а ў адносінах з Амеліяй, яна «сама як абраз» – вядзе выключна праведнае жыццё. Надзвычай прыгожы твар жанчыны – адбітак яе лагоднага характару, у блакітных вачах заўважаецца *«ціхая меланхолія і нейкія чароўныя мроі»* [10, с. 229], што, па нашым меркаванні, сталі адзнакай празарлівых здольнасцей гераіні. Амелія інтуітыўна адчувала, што ў яе бок скіравана зло ад страшнага чарнакніжніка, але яна не выступіла варожа і ваяўніча супраць яго, выканала ўсе загады мужа, нават адрэзала прыгожыя і доўгія валасы, страціла свае жыццёвыя сілы толькі дзеля спакою мужа. Амелія ў філасофскамастацкай канцэпцыі Я. Баршчэўскага сапраўдны ідэйна-маральны ідэал, яна ахвяравала сваім жыццём дзеля перараджэння мужа і стала зямным увасабленнем Нябеснай Дзевы.

Зямны ідэал увасоблены ў Амеліі, але яго не разгледзеў Генрык і сваімі ўчынкамі загубіў бедную жанчыну. Ён стварыў для сябе падманны ідэал, для яго вялікім аўтарытэтам быў страшны старац, сапраўдную сутнасць якога празарліва ўбачыла і адчула Амелія.

Гібель Амеліі, як адкупленчая ахвяра, стала завяршэннем духоўнай дасканаласці гераіні, якая дае яе мужу магчымасць адрадзіцца, духоўна перахварэўшы. Хваравітае ажыўленне валасоў на галаве Генрыка – знак актыўнага жыцця душы і духу героя, які быў паралізаваны пад уздзеяннем своеасаблівага гіпнатычнага ўплыву страшнага старца, і толькі пакуты жонкі, яе самаахвярнасць і смерць далі імпульс для яго будучага абнаўлення. Цяпер ён зможа праявіць сябе ў розных сферах, няхай то і грамадска-палітычная дзейнасць, на якую скіроўвае ўвагу М. Хаўстовіч. Даследчык лічыць, што, «перадаючы Генрыку ўласцівасці валасоў Амеліі, пісьменнік меў на ўвазе перамены, якія адбыліся з героем: цяпер ён не чэрствы і абыякавы да краёвых праблемаў чалавек» [6, с. 146], ён занядужаў «хваробай патрыятызму, якая мучыць Сына Буры, Пакутнага Духа, гэта пачуццё любові да роднага краю» [6, с. 146].

Інакш кажучы, паводле філасофска-мастацкай канцэпцыі аўтара, падмуркам якой выступае рэлігійнае светаадчуванне пісьменніка, ідэальны герой будзе заклікаены выканаць адметную грамадска-палітычную місію, ён павінен прайсці складаны шлях *духоўнага ўзрастання, які рэалізуецца ў спасціжэнні ідэальнай прыгажосці, у перажыванні кахання або ярка выяўленага творчага тамлення.*

Творча апантанай асобай з'яўляецца летуценнік Севярын, які працяглы час жыў у ідэалізаванай прасторы, ён адмовіўся ад сучаснай рэчаіснасці, а для сябе стварыў ідэал, звяртаючыся да агульначалавечага, мінулага (Антычнасць, Рым). Усюды летуценнік бачыць пастушак, гулі, радасць. *«Спачатку толькі ва ўяўленнях бачыў пекных багінь на лугах і гаях, потым спаткаў у свеце сваю багіню Адэлю. Першыя чатыры гады былі шчаслівыя, але "вужака золата" і ганарлівасці звяла Адэлю, яна здрадзіла Севярыну і выйшла замуж за іншага»* [10, с. 309]. Гэтая падзея парушыла раўнавагу і ўяўную гармонію Севярына. «Першае каханне, да таго ж яшчэ нешчаслівае – найвышэйшая навука, пасля якое чалавек з увагаю пачынае чытаць кнігу жыцця. Хутка зразумеў Севярын, што *"свет не рай, а людзі не анёлы"*» [10, с. 309]. Безнадзейнае, непадзельнае пачуццё прывяло яго да «чорнай меланхоліі», ён усё цяпер бачыць у чорных фарбах. Раней яго захапляла паэзія грэкаў і шчырае каханне патрыярхальных часоў, цяпер жа – журботная фантазія. Дзеючымі персонамі якой сталі мухі, якія залятаюць у пакой, снуюць паўсюль, яны перашкодзілі Адэлі па-сапраўднаму ўспрыняць пачуцці Севярына да яе, яны *«лёталі і звінелі датуль над вухам дзяўчыны, пакуль яна зусім не забыла пра мяне і пра мае вершы»* [10, с. 310]. У абліччы надакучлівых мух угадваюцца чалавечыя абрысы, *«яны пераменяюцца ў дзіўных монстраў, гэтыя іх страшныя крылы здаюцца фракамі на нязграбных людзях, а твары іх рознай формы: адны круглыя, шырокія з крывавымі плямамі, другія – сухія з вострaю бародкаю і доўгімі валасамі. І ўсе гэтыя страшыдлы глядзяць на мяне: адны здзекліва, другія пагрозліва»* [10, с. 310]. Меланхалічныя ўяўленні летуценніка Севярына яскрава раскрываюць варожасць ва ўзаемаадносінах свету і героя. Абездухоўленасць, маральная дэградацыя ўвасобілася ў вобразах мух і пражэрлівай, вечна жывой Саранчы, з падвойнымі шэрымі крыламі, якія яна *«ўвосень скідае, ператвараецца ў вадзяное страшыдла і там жарэ ўсё. Прыйдзе вясна, у яе адрастаюць крылы, яна як вогненны цмок вылятае з вады з разяўленаю пашчаю, яна прагне здабычы. Ці не яна заразіла чалавечыя сэрцы?»* [10, с. 310]. Такія яркія фантазіі мог стварыць толькі творчы чалавек, талент якога роднасны вар'яцтву, нездарма ж *«усе, хто ведаў Севярына, жартавалі з яго і называлі вар'ятам»* [10, с. 309]. У вар'яцтве летуценніка праявілася яго непаўторная таленавітая натура. У сваіх штутгарцкіх лекцыях Шэлінг адзначаў, што асновай самога розуму з'яўляецца вар'яцтва <…> якое, на думку мысляра, – *«не хвароба, а своеасаблівы стан чалавечага духу, які стаў перадумовай творчага пачатку»* [12, с. 70].

Сапраўды, творчы патэнцыял прысутнічае ў летуценніка Севярына, ён жа піша вершы, але, перажыўшы здраду ў каханні, (якое для героя было вышэйшай рэальнасцю) расчараваўся, упаў у глыбокую журботнароспачную меланхолію: *«Пасля гэтага здарэння зрабіўся <…> ён самотны, усе ягоныя мары былі жахлівыя, уцякаў ад людзей, мілай была адзінота, найпрыемнейшы быў яму малюнак неба і толькі тады, калі ў чорных хмарах адзываліся грымоты, выў вецер»* [10, с. 309]. Севярын, як трапна заўважае М. Хаўстовіч, *«чакае тыя змены, якія можа прынесці пэўная грамадская з'ява, увасобленая рамантыкамі ў матыве буры»* [6, с. 185]. *«І не толькі чакае, але і прыкладае намаганні, каб наблізіць гэтую буру. Герой Баршчэўскага пазнае ў нікчэмных жамярыцах "постаці шкадлівых людзей"»* [10, с. 310], і «апавядае пра дзівы іншым» [6, с. 185], інакш кажучы, садзейнічае ўзрастанню буры.

«Дзіцём буры» з'яўляецца і Сын Буры – сын бацькоў, гнаных Бураю і Неспакоем, яго бацька *«не разарваў жалезных кайданаў, якія колькі год упіваліся ў яго рукі і ногі. Нескончаныя слёзы і нараканні маці паўплывалі на маю натуру»* [10, с. 175]. Сляпы Францішак лічыць, што сын Буры падобны да Плачкі, якая ва ўяўленні ўзрушанага героя была цудоўнай багіняй. Яна ў прыгожай сукенцы напаткала і паказала яму *«з высокіх гор <…> далёкі свет, над якім пад аблокамі луналі арлы»* [10, с. 175], але ў хуткім часе цудоўная гераіня знікла і герой вымушаны «блукаць па волі Буры».

Сын Буры, як і летуценнік Севярын прагне свабоды, нездарма ж ён убачыў той вольны свет, над якім лунаюць арлы. Свабодалюбівыя птушкі *«здольныя лётаць і кідаць гром і маланкі, паднімацца так высока, што заўжды перамагаюць нізкія сілы»* [10, с. 362]. Магчыма, рамантычны герой Я. Баршчэўскага адчуў хуткі наступ новых часоў, успрыняў узрастанне неверагодных сіл і цяпер ён знаходзіцца ў стане нейкай духоўнай мяжы, яго пачуцці «абвастрыліся». Сын Буры чакае змен грамадскага і сацыяльнага характару,

але ён не мае дакладнай праграмы дзейнасці, вось і вымушаны *«лётаць па волі Буры»* [10, с. 175].

Шляхі рамантычных герояў Я. Баршчэўскага ў бурапенным віры жыцця паступова акрэсліваюцца, вызначаюцца іх выніковыя мэты. Так, прысутныя, якія праслухалі гісторыю сына Буры ў выкладзе сляпога Францішка, раяць неўтаймаванаму герою звярнуцца да Бога (*«Чаму ж ён не прыйдзе да Бога, заступніцтва Божае ўваскрашае надзеі»* [10, с. 176] ).

Летуценнік Севярын гаворыць, што навек забудзе пра Адэлю (ня- спраўджаны ідэал), але заўжды будзе памятаць пра родны край, абавязкова прыгадае, нават думаючы, што не вернецца з далёкай вандроўкі і памрэ на вяршыні гары ў чужым краі, *«крукі занясуць мае косці; усё лепей быць пасля смерці з птушкамі, а не з чарвякамі»* [10, с. 311]. Але гэты свабодалюбівы дэвіз выказаны летуценнікам Севярынам (апавяданне «Летуценнік Севярын») змяняецца новым вітком меланхоліі і роспачы. Пасля доўгага растання летуценнік адведаў сваю Радзіму і быў вельмі засмучаны пераменамі ў родным краі: *«змрочны час, неўраджайныя гады, зніклі вясёлыя забавы сялян»* [10, с. 247].

Расчараванне, цяжкі смутак і туга адбіліся на яго твары, у фінале апавядання «Таварыш у падарожжы» герой нагадвае журботны магільны камень. І толькі ў паэме «Жыццё Сіраты» Севярын-Музыка знайшоў энергійнае ажыўленне, духоўную апору і ідэал – Альму, якая натхняе яго на праўдзівае адлюстраванне народных памкненняў і жаданняў, цяпер яго музыка заклікана спрыяць распаўсюджанню справядлівасці ў Сусвеце.

Урач Саматніцкі («Душа не ў сваім целе») таксама праходзіць выпрабаванне ідэалам. Ён – рамантычны герой, якому ўласціва незвычайная адданасць, максімалізм. Саматніцкі страціў галаву, калі пачуў, што яго каханая ў небяспецы, і паляцеў як мага хутчэй, не схаваў сваё цела, а пасля выратавання любай асобы ён не ўбачыў сваёй цялеснай абалонкі. Непарыўную повязь цела і душы Саматніцкі парваў без дазволу Усявышняга. Ён страціў фізічнае цела, памёр, яго неўміручая душа перасялілася ў іншае, чужое цела, якое і стала трунай для яго душэўнага пачатку. Урач Саматніцкі ахвяраваў сабой, сваім целам, парушыўшы повязь «душа – цела», страціў сябе і потым шчыра раскайваўся, шкадаваў, што не паслухаўся, як яго перасцерагалі. Ён прыгадваў, як пакінуў без увагі папярэджванні Рыльца, моц каляровых водаў выкарыстаў на іншае, *«забыўся пра мінулае, хацеў ужо сёння быць у Раі, хацеў бачыць духа ў постаці анёла, < > пазнаў Адэлю і яна стала для маёй душы тым Богам, тым ідэалам, якога шукаў на гэтым свеце, думаў пра яе, пра яе марыў, душа мая спакойнай быць не можа, забыўся пра сваё цела, забыўся пра зямное жыццё, загубіў сябе»* [10, с. 334]. Пан Рылец папярэджваў яго не ўзірацца ў іншую душу, *«якая створана так, як і твая»* [10, с. 334]. А Саматніцкі так бяздумна ўзіраўся ў душу Адэлі, хаця яго каханая – *ідэал ілюзорны*, ёй прыпісваецца тое, чым яна не валодае. Адэля не адчувае душу Саматніцкага, яна яму чужая, ён не вернецца туды, бо ніхто яго не пазнае, яна не пазнае, не пашкадуе, смяяцца будзе як з вар’ята. Саматніцкі павінен быць расчараваны, але ён упарта моліцца ў выдуманы ідэал, неадменна балюча, хваравіта думае пра Адэлю. Калі да яго прыйшоў Зянон, урач Саматніцкі ўзгадвае сваю каханую дзяўчыну, якая добра вабіць час у сябрыне знаёмых. Яна красуецца, у глыбіні яе душы паказушнасць. Адэля не захоплена ідэяй служыць Айчыне, яна не будзе займацца навукай, даследаваннем таямніцаў прыроды, для яе галоўнае – прыгожыя строі, новыя забавы і сяброўства. Цяпер для Саматніцкага толькі адна перспектыва: пахаваць чужое цела ў чужой зямлі. Герой Я. Баршчэўскага загубіў сябе, а, галоўнае, страціў магчымасць на ўсю поўніцу служыць Радзіме.

Такім чынам, у рамантычным свеце Яна Баршчэўскага – аўтара зборніка «Шляхціц Завальня…», аповесці «Душа не ў сваім целе» выразна прасочваюцца памкненні герояў да ідэалу. Напачатку гэта адбілася ў паказе цэлай плеяды персанажаў, з ярка выражанай індывідуальнасцю. Такім выступае Васіль з апавядання «Зухаватыя ўчынкі», які ўсвядоміў сябе зусім вольным чалавекам, паставіў сябе над людзьмі, парушыў гарманічную раўнавагу, пераступіў праз *абсалютны ідэал* (які ўяўляўся пісьменніку ў паказе гарманічнага суіснавання чалавека і прыроды, чалавека і грамадства) і, у рэшце рэшт, перажыў поўнае адчужэнне, замыканне ў сабе, акамяненне, ён стаў падобны да ідала.

Літаратура

1. *Гарэцкі, М.* Гісторыя беларускай літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск : Мастацкая літаратура. 1992. – 479 с.
2. *Лойка, А. А.* Гісторыя беларускай літаратуры Дакастрычніцкі перыяд / А. А. Лойка. – Мінск : Вышэйшая школа, 1977. – Ч. 1. – С. 94–95.
3. *Ботникова, А. Б.* Немецкий романтизм: диалог художественных форм / А. Б. Ботникова. – Воронеж : Воронежский государственный университет, – 2004. – 337 с.
4. *Франк, С. Л.* Достоевский и кризис гуманизма / С. Л. Франк. – СПб. : Русское мировоззрение, – 1996. – С. 362–366.
5. *Каваленка, В. А.* Вытокі. Уплывы. Паскоранасць: Развіццё беларускай літаратуры XIX–XX стагоддзяў / В. А. Каваленка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 333 с.
6. *Хаўстовіч, М. В.* Мастацкі метад Яна Баршчэўскага / М. В. Хаўстовіч. – Мінск : БДУ, 2003. – 203 с.
7. *Хаўстовіч, М. В.* Ідэальны герой у прозе Яна Баршчэўскага / М. В. Хаўстовіч // Беларускае літаратуразнаўства. Навукова-метадычны часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. – № 1 – Студзень – Жнівень. – 2002 – С. 81–96.
8. *Шыдлоўскі, С. А.* Шляхецкі саслоўны ідэал у творах Яна Баршчэўскага / С. А. Шыдлоўскі // Вестник Полоцкого государственного университета : Серия А (гуманитарые науки). – 2005. – № 7. – С. 128–131.
9. *Лецка, К. І.* Вытокі і генезіс беларускага рамантызму XIX стагоддзя : манаграфія / К. І. Лецка. – Гродна : ГрДУ, 2003. – 370 с.
10. *Баршчэўскі, Я.* Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі / Укладанне, прадмова і каментарыі М. Хаўстовіча. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1998. – 480 с.
11. Біблія. Кнігі Святога Пісання Старога і Новага Запаветаў. – Мінск: Біблейскае таварыства ў рэспубліцы Беларусь, 2012. – 1112 с.
12. Schelling. Samtliche Werke. Abtheilung 1, Bd 7. Stuttgart – Augsburg, – S. 70–71.

References

1. *Garetski, M.* Gistoryya belarustay litaratury / M. Garetski. – Minsk : Mastatskaya litaratura, 1992. – 479 s.
2. *Loyka, A. A.* Gistoryya belaruskay litaratury. Dakastrychnitski peryyad / A. A. Loyka. – Minsk : Vysheyshaya shkola, 1977. – Ch. 1. – S. 94–95.
3. *Botnikova, A. B.* Nemetskiy romantizm: dialog khudozhestvennykh form / A. B. Botnikova. – Voronezh : Voronezhskiy gosudarstvennyy universitet. – 2004. – 337 s.
4. *Frank, S. L.* Dostoyevskiy i krizis gumanizma / S. L. Frank. – SPb. : Russkoye mirovozzreniye. – 1996. – S. 362-366.
5. *Kavalenka, V. A.* Vytoki. Uplyvy. Paskoranasts: Razvittsyo belaruskay litaratury XIX-XX stagoddzyau / V. A. Kavalenka. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1975. – 333 s.
6. *Khaustovich, M. V.* Mastatski metad Yana Barshcheuskaga / M. V. Khaustovich. – Minsk : BDU, 2003. – 203 s.
7. *Khaustovich, M. V.* Idealny geroy u proze Yana Barshcheuskaga / M. V. Khaustovich // Belaruskaya litaraturaznaustva. Navukova-metadychny chasopis Belaruskaga dzyarzhaunaga universiteta. – № 1 – Studzen – zhniven. – 2002 – S. 81–96.
8. *Shydlouski, S. A.* Shlyakhetski saslouny ideal u tvorakh Yana Barshcheuskaga / S. A. Shydlouski // Vestnik Polotskogo gosudarstvennogo universiteta : Seriya A (gumanitarnyye nauki). – 2005. – № 7. – S. 128–131.
9. *Letska, K. I.* Vytoki i genesis belaruskaga ramantyzmu XIX stagoddzya : managrafiya / K. I. Letska. – Grodna : GrDU, 2003. – 370 s.
10. *Barshcheuski, Ya.* Vybranyya tvory / Ya. Barshcheuski / Ukladannye, pradmova i kamentaryi M. Khaustovicha. – Minsk : Belaruski knigazbor, 1998. – 480 s.
11. Bibliya, Knigi Svyatoga Pisannya Staroga i Novaga Zapavetau. – Minsk: Bibleyskaye tavarystva u Respublitsy Belarus, 2012. – 1112 s.
12. Schelling. Samtliche Werke. Abtheilung 1, Bd 7. Stuttgart – Augsburg, – S. 70–71.